# ГІСТОРЫЯ

УДК 908(476.7-25)

***А. М. Вабішчэвіч***
*д-р гіст. навук, праф., заг. каф. гісторыі славянскіх народаў*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
e-mail: vabischev@rambler.ru

## СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ ГІСТОРЫКА-КРАЯЗНАЎЧАГА ВЫВУЧЭННЯ БРЭСТА (ДА 1000-ГОДДЗЯ ГОРАДА)

*Прааналізаваны гістарычныя і краязнаўчыя даследаванні горада Брэста, 1000-годдзе якога адзначаецца ў 2019 г. Прадметам вывучэння сталі найбольш значныя і адметныя працы пра Брэст, асаблівая ўвага звернута на публікацыі вучоных і краязнаўцаў пачынаючы з XIX ст. Выдзелены асноўныя перыяды вывучэння гісторыі горада, асаблівасці кожнага з іх. Адзначаны ўклад у гісторыка-краязнаўчыя даследаванні ўстаноў адукацыі (у тым ліку Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна), культуры, органаў дзяржаўнага кіравання, грамадскіх арганізацый, прадстаўнікоў інтэлігенцыі. Вылучаны нявырашаныя пытанні, якія застаюцца цяпер у справе вывучэння гісторыі Брэста, зроблены канкрэтныя прапановы аб далейшым выяўленні, навуковай апрацоўцы і ўвядзенні ў навуковы зварот дакументальных крыніц з фондаў архіваў, бібліятэк, музеяў Беларусі і замежных краін; падрыхтоўцы абагульняючай фундаментальнай працы; распрацоўцы слаба вывучаных тэм; каардынацыі гісторыка-краязнаўчай працы; вывучэнні гісторыі г. Брэста ў сярэдніх школах; вучэбнай і навукова-метадалагічнай падрыхтоўцы па краязнаўстве студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей і інш.*

**Уводзіны**

Горад Берасце (Бярэсце) згадваўся яшчэ ў старажытнарускіх летапісах XI–XII стст. Звесткі апісальнага характару ўтрымліваліся ў хроніках, дзённіках і мемуарах падарожнікаў. Творчай кампіляцыяй папярэдніх хронік Я. Длугаша і інш. сярэдневяковых аўтараў з'яўляецца «Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсяе Русі» М. Стрыйкоўскага (1582). Берасце і Берасцейскае ваяводства згадваў А. Гваньіні ў «Хроніцы Еўрапейскай Сарматыі» (1578 і 1581 гг.), у якой упершыню пазнаёміў заходнееўрапейскага чытача з гісторыяй ВКЛ. Да сённяшняга часу каштоўнай крыніцай па старажытнай гісторыі горада з'яўляецца гравюра шведскага ваеннага інжынера Э. Дальберга «Асада Бярэсця шведамі ў 1657 г.», якая была змешчана ў выдадзенай С. фон Пуфендорфам «Гісторыі Карла Густава…» у 1696 г. у Нюрнбергу. Значнай крыніцай для вывучэння канфесійнага жыцця ў XVII ст. з'яўляецца «Дыярыуш» Афанасія Брэсцкага (Філіповіча) [1], які быў ігуменам манастыроў Сімяона Стоўпніка і Раства Прасвятой Багародзіцы.

Аднак да XIX ст. нельга гаварыць пра існаванне грунтоўнага краязнаўства Берасця (Бярэсця, Брэста) як усебаковага вывучэння гісторыі, геаграфіі, эканомікі, культуры горада навукова-даследчымі ўстановамі, мясцовым насельніцтвам. Гісторыка-краязнаўчае даследаванне Брэста і яго наваколля пачалося ў складзе Расійскай імперыі з сярэдзіны XIX ст.

Мэта дадзенага артыкула – абагульненне ведаў пра вывучэнне гісторыі, краязнаўства Брэста. Для дасягнення пастаўленай мэты вызначаны наступныя задачы:

1) прааналізаваць асноўныя надрукаваныя працы, прысвечаныя гісторыі г. Брэста, выдзеліць асноўныя перыяды ў вывучэнні гісторыі горада, даць іх характарыстыку;

2) ацаніць уклад у гісторыка-краязнаўчыя даследаванні другой паловы XX – пачатку XXI ст. асобных навучальных устаноў, устаноў культуры, органаў дзяржаўнага кіравання, грамадскіх арганізацый, мясцовых краязнаўцаў;

3) ахарактарызаваць дасягненні ў вывучэнні лакальнай гісторыі Брэста па стане на 2019 г., вызначыць перспектыўныя напрамкі даследаванняў, больш эфектыўныя сродкі пашырэння краязнаўчых ведаў, асабліва сярод школьнікаў, студэнтаў, шляхі ўдасканалення вучэбнай і навукова-метадалагічнай падрыхтоўкі па краязнаўстве.

**Гісторыка-краязнаўчыя даследаванні Брэста**

Хоць звесткі пра Берасце (Бярэсце) з'яўляліся ў пісьмовых крыніцах з ранняга сярэднявечча, аднак гісторыка-краязнаўчыя працы, прысвечаныя этнаграфіі, культуры, гісторыі горада, з'явіліся з 40-х гг. XIX ст., што было звязана з разгортваннем навуковых даследаванняў гісторыі і культуры беларускіх зямель. Адной з першых была кніга П. Шпілеўскага «Падарожжа па Палессю і Беларускаму краю» (1858) [2], дзе змешчаны багаты этнаграфічны матэрыял, у т. л. легенда пра ўзнікненне горада – пра купца, які выкарыстаў бярозавую кару (бяросту) для таго, каб выехаць з балота (адсюль і назва Бярэсце). У 1863 г. П. Баброўскі выдаў асобны том пра Гродзенскую губерню, дзе былі змешчаны звесткі пра гаспадарчае развіццё, побыт, матэрыяльную культуру [3]. Разнастайны факталагічны матэрыял утрымліваецца ў «Памятных кніжках Гродзенскай губерні», што выдаваліся штогод да пачатку Першай сусветнай вайны [4].

Інтарэс уяўляюць звесткі пра Брэст-Літоўск, змешчаныя ў публікацыях рускіх пісьменнікаў А. Грыбаедава, Ф. Рашэтнікава. Асабістыя ўражанні пра горад і яго наваколле можна знайсці ў польскамоўных працах Ю. Крашэўскага «Дзённікі маіх часоў…» (1848), «Гістарычныя падарожжы па польскіх землях…», «Успаміны пра Палессе, Валынь і Літву» (1840), у этнаграфічным нарысе «Адзенне сялян і мяшчан наваколляў Брэста, Кобрына, Пружан» (1880) і інш.

У другой палове XIX ст. з'явіліся шматтомныя выданні Віленскай археаграфічнай камісіі, Паўночна-Заходняга аддзела Рускага геаграфічнага таварыства. У асобных тамах Актаў Віленскай археаграфічнай камісіі былі надрукаваны дакументы па гісторыі старажытнага Брэста XIV–XIX стст. (у прыватнасці, акты гродскага суда [5]). У 1897 г. у «Дакументах Маскоўскага архіва юстыцыі» пад рэдакцыяй М. Доўнар-Запольскага ўпершыню было надрукавана «Апісанне староства Берасцейскага 1566 г.», складзенае Д. Сапегам.

Каштоўным дапаможнікам для карыстальнікаў стала кніга 1883 г. па бібліяграфіі Палесся за 1855–1880 гг., падрыхтаваная першай рускай жанчынай-бібліёграфам З. Пенкінай з Публічнай бібліятэкі Санкт-Пецярбурга [6]. Краязнаўчыя матэрыялы змяшчаліся на старонках «Гродненских губернских ведомостей», «Епархиальных ведомостей» і іншых мясцовых перыядычных выданняў, а таксама ў сталічных расійскіх выданнях.

Нягледзячы на русіфікатарскую тэндэнцыю, да краязнаўчай працы далучаліся праваслаўныя святары. Свяшчэннік Л. Паеўскі падрыхтаваў кнігу «Город Брест-Литовск и его древние храмы» (1894) [7].

Адна з першых кніг па гісторыі брэсцкай яўрэйскай абшчыны была выдадзена ў 1886 г. у Варшаве на старажытнаяўрэйскай мове А. Л. Файнштэйнам (магчыма, у суаўтарстве з А. Фінкельштэйнам) [8]. У дзвюх яе частках разглядаецца гісторыя Брэста да будаўніцтва крэпасці ў 1836–1842 гг. і пасля ўзвядзення крэпасці, калі горад быў перанесены на ўсход ад яе.

У 1907 (1908) г. была выдадзена кніга «История города Брест-Литовска. 1016–1907. По достоверным источникам и правдоподобным умозаключениям», складзеная ўраджэнцам горада Х. Зоненбергам [9]. Яе можна разглядаць як адну з першых спроб, яшчэ вельмі недасканалую, гісторыка-краязнаўчай працы папулярнага характару. Складальнік выдзеліў тры эпохі ў гісторыі горада: «Брэст пераходны» (да канца XIV ст.); «Брэст (Літоўск) – польскі (польска-літоўскі) горад» (да 1815 г.); «Брэст-Літоўск – горад рускі».

Яшчэ ў дарэвалюцыйны час пачаліся разыходжанні адносна пачатковай даты ў гісторыі Брэста. У прадмове да трэцяга тома Актаў Віленскай археаграфічнай камісіі яе старшыня Я. Галавацкі адзначаў, што ўпершыню ў летапісах Бярэсце згадана ў 1016 г. [5, с. V]. На яго спасылаўся і паўтараў дату 1016 г. у сваёй кнізе і Х. Зоненберг [9, с. 6]. Гэтая ж дата была і ў календарах-даведніках, што выйшлі напярэдадні Першай сусветнай вайны (іх складваў Я. Хмелеўскі) [10, с. 32]. Бярэсце як горад, які ў 1015 г. уваходзіў у склад Тураўскага княства, адзначалася ў Л. Паеўскага (таксама ўказвалася, што ў летапісах Бярэсце ўзгадвалася з 1016 г.) [7, с. 3]. У названай вышэй працы П. Баброўскага фігуравала дата 1018 г. [3, с. 810], спасылка ім рабілася на Ю. Ярашэвіча.

Аднак з таго часу найбольшае пашырэнне атрымалі 1017 і 1019 гг. Дарэвалюцыйныя расійскія гісторыкі М. Карамзін, С. Салаўёў перавагу аддавалі першаму спісу Наўгародскага летапісу, дзе было напісана, што *«в лето 6525 (1017) Ярослав иде к Берестью»*. Іншыя вучоныя спасылаліся на «Аповесць мінулых гадоў» (Іпацьеўскі і інш. летапісы), дзе Бярэсце ўпершыню ўзгадана пад 6527 (1019) як буйное, добра ўмацаванае паселішча. У Іпацьеўскім летапісе адзначана: *«А Святополк бежа. Бежащю же ему и нападе на нь бес. И раслабеша кости его и не можаше седети на кони. И ношахуть и в носилах. И принесоша и к Берестию»* [11, с. 132]. У дарэвалюцыйны час гэтую пазіцыю адстойвалі В. Тацішчаў і А. Шахматаў.

Публікацыі па гісторыі Брэста, што выйшлі ў дарэвалюцыйнай Расійскай імперыі, за рэдкім выключэннем былі пераважна звязаны з Палессем. Гэта былі ў асноўным папулярныя працы, што не ўтрымлівалі навуковага апарату. Яны не мелі спасылак на дакладныя крыніцы, нярэдка ўтрымлівалі розныя паданні, легенды.

Пасля Першай сусветнай і польска-савецкай войн краязнаўства Брэста аднавілася толькі ў 1921–1939 гг. Цяпер яно развівалася ў кантэксце ідэй «польскага рэгіяналізму». У 1924 г. быў створаны Брэсцкі аддзел Польскага краязнаўчага таварыства, які наладжваў навукова-папулярныя лекцыі, займаўся апекай над помнікамі гісторыі і культуры. У культурна-асветніцкай працы актыўна выкарыстоўвалася манаграфія «Ілюстраванае Палессе» А. Нелярда (1923), у якой былі сабраны народныя песні, вершы, загадкі. У 1926 г. пры падтрымцы аддзела ПКТ у Брэсце быў выдадзены «Rocznik Poleski» («Палескі штогоднік»), дзе змяшчаліся статыстычныя матэрыялы, артыкулы па краязнаўстве. На старонках часопіса «Kresy ilustrowane» («Ілюстраваныя акраіны») спачатку змяшчаліся краязнаўчыя рубрыкі, потым выданне было поўнасцю прысвечана краязнаўчай тэматыцы [12, с. 83]. Рэдактарам і выдаўцом часопіса быў В. Мандальскі, якому належыць таксама аўтарства шэрагу прац па краязнаўстве, у т. л. геаграфічны і гістарычны нарыс пра Брэст [13]. У даведніку М. Марчака пра Палессе (1935) утрымліваліся звесткі пра матэрыяльныя каштоўнасці рэгіёна. Краязнаўствам Брэста займаўся і Р. Гарашкевіч [14]. Цяпер з’яўляецца бібліяграфічнай рэдкасцю кніга на ідыш А. Каплана «Разбурэнне Брэста ў гады Сусветнай вайны» (1925). Адзін з яе экзэмпляраў выявіла В. Кнорынг у Расійскай нацыянальнай бібліятэцы (С.-Пецярбург). У 1938–1939 гг. Т. Жук-Рыбіцкі праводзіў археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці.

Пасля ўз’яднання заходнебеларускіх зямель з БССР восенню 1939 г. Брэст стаў абласным горадам рэспублікі. У кантэксце разгорнутай саветызацыі быў прадвызначаны агульны характар вывучэння мінулага гораду, звярталася ўвага на адлюстраванне прыгнечанага стану жыхароў у дарэвалюцыйны час, прапаганду савецкага ладу жыцця.

У час Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг. айчынная гісторыка-культурная спадчына панесла вялікія і незваротныя страты. У пасляваенныя дзесяцігоддзі краязнаўства Брэста аднаўлялася на аснове савецкай ідэалогіі, фактычна без выкарыстання назапашанага ў вывучэнні мінулага горада ў дарэвалюцыйнай Расіі і міжваеннай Польшчы. Найбольшая ўвага надавалася вывучэнню гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, падпольнага патрыятычнага антыфашысцкага руху, партызанскай барацьбы. У акадэміч-

ных выданнях Інстытута гісторыі, дзе гісторыя Брэста разглядалася ў агульным кантэксце гісторыі Беларусі, былі закладзены асновы гістарычнага краязнаўства.

У 1950-я – сярэдзіне 1960-х гг. у спрэчцы аб першым летапісным упамінанні Брэста ў савецкай гістарычнай навуцы стала вядучай пазіцыя акадэміка М. Ціхамірава, які сярод старажытнарускіх гарадоў XI ст. упамінаў і Бярэсце ў 1019 г. [15, с. 33, 326]. Гэтай думкі прытрымліваліся М. Беражкоў і Д. Ліхачоў. У «Гісторыі Беларускай ССР» (1961) сярод 10 гарадоў, якія названы ў летапісах на заходніх землях Русі, Брэст згадваецца пад 1019 г. [16, с. 32]. Аднак былі і прыхільнікі даты 1017 г.

Партыйныя і савецкія органы Брэста выступілі з ініцыятывай святкавання 950-годдзя горада ў маі 1967 г., аднак не атрымалі дазволу ад ЦК КПБ. Пасля паўторнага звароту была атрымана згода на правядзенне ўрачыстасцей у маі 1969 г. [17, с. 11]. Да юбілею Брэста быў падрыхтаваны гісторыка-эканамічны нарыс [18]. Тыя ўрачыстасці паклалі пачатак традыцыі святкавання Дня горада.

Праведзеныя П. Лысенкам археалагічныя раскопкі гарадзішча Бярэсця ў 1968–1981 гг. паказалі, што як пагранічная крэпасць і апорны пункт славянскай каланізацыі горад быў заснаваны ў канцы X ст. [19, с. 5, 11–13]. Першае ўпамінанне Бярэсця звязана менавіта з 1019 г. Здзейсненае маштабнае навуковае адкрыццё адлюстравана ў працах П. Лысенкі [20]. Адкрыты ў 1982 г. археалагічны музей «Бярэсце» з’яўляецца ўнікальным аб’ектам культурнай спадчыны, адзіным у свеце музеем сярэдневяковага ўсходнеславянскага горада. На афіцыйным узроўні 1019 г. стаў агульнапрызнанай датай першага летапіснага ўпамінання Брэста. Аднак спрэчкі аб пачатковым пункце адліку гісторыі Брэста працягваюцца і да цяперашняга часу – 1017 г. адстойваюць А. Гладышчук, А. Нікітчык і іншыя сучасныя аўтары.

У 1950–1980-я гг. краязнаўчыя матэрыялы размяшчаліся на старонках газет, гучалі па радыё. Папулярызацыяй гісторыка-краязнаўчых ведаў займаліся М. Алексяюк, І. Біруля, В. Ласковіч, В. Купцова, Г. Церабунь і інш.

Хоць мэта створанага ў 1965 г. Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры была заідэалагізаванай (*«прыцягненне шырокай грамадскасці да актыўнага ўдзелу ў ахове помнікаў гісторыі і культуры, павышэнне іх ролі ў камуністычным выхаванні савецкіх людзей»*), што прадвызначыла прыярытэтны клопат пра помнікі рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы, аднак праводзілася значная праца па мемарыялізацыі пахаванняў савецкіх воінаў і партызан, мірных ахвяр Вялікай Айчыннай вайны. Значнай падзеяй стаў выхад Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі па Брэсцкай вобласці [21]. У энцыклапедычным даведніку «Брэст» (1987) у аглядавым нарысе быў змешчаны матэрыял па гісторыі, аднак значная яго частка адведзена рэвалюцыйным падзеям, гісторыі кампартыі [22, с. 12–67].

Актыўна займаліся пошукавай працай настаўнікі, працоўная і студэнцкая моладзь, школьнікі. У многіх школах, вучылішчах былі створаны ваенна-патрыятычныя клубы, музеі (напрыклад, гісторыка-краязнаўчы музей СШ № 16 на чале з Заслужаным настаўнікам БССР А. Башчук), патрыятычны клуб «Помнікі Айчыны расказваюць» ПТВ № 151 (кіраўнік – Ганаровы краязнаўца Беларусі М. Клімец). У 1957 г. у Брэсце была заснавана абласная станцыя юных турыстаў (з 2011 г. – Брэсцкі абласны цэнтр турызму і краязнаўства дзяцей і моладзі).

Ажыўленне краязнаўчага руху назіралася з канца 1980-х – пачатку 1990 гг. У студзені 1989 г. у Брэсце адбылася першая абласная канферэнцыя краязнаўцаў, ініцыятарам правядзення якой быў У. Мелішкевіч. Са стварэннем у канцы 1989 г. Беларускага краязнаўчага таварыства вывучэнне гісторыі і краязнаўчая праца актывізаваліся. У незалежнай Рэспубліцы Беларусь з разгортваннем нацыянальна-культурнага адраджэння адбывалася развіццё краязнаўчага руху. У Брэсце актыўнасць праяўляла грамадскае аб’яднанне «Стары горад» (1991–2007) на чале з І. Лаўроўскай, аўтарам публі-

кацый па ўрбаністыцы старажытнага Брэста. У 1994 г. быў праведзены Фестываль берасцейцаў свету, навукова-практычная канферэнцыя «Гісторыя і сучаснасць Брэстчыны».

У рамках выканання рэспубліканскіх і абласных праграм захавання і развіцця культуры ўладамі Брэсцкай вобласці і г. Брэста ў 1990-я гг. – пачатку XXI ст. нямала зроблена ў справе зберажэння гісторыка-культурнай спадчыны. Ужо стаў добра вядомым «брэсцкі вопыт» аховы гісторыка-культурнай спадчыны [23, с. 165–171], паспяхова выкананы цэлы шэраг праектаў у гэтым напрамку [24]. У 1997 г. пры Брэсцкім аблвыканкаме быў створаны каардынацыйны савет па ахове матэрыяльнай і духоўнай спадчыны. Ініцыятарам яго стварэння і сакратаром быў Л. Несцярчук, аўтар даследавання пра замкі і паркі Берасцейшчыны [25], гісторыка-біяграфічных прац пра С. А. Панятоўскага, Т. Касцюшку, М. К. Агінскага, Н. Орду. Ахавай помнікаў гісторыі і культуры, мемарыялізацыяй пахаванняў ваеннаслужачых Першай і Другой сусветных войнаў, ахвяраў германскага нацызму займаецца А. Кондак.

З 1990-х гг. пачалі друкавацца ўспаміны ўраджэнцаў Брэста, першымі сярод якіх былі кнігі М. Мантвілава [26], Д. Вашчукоўны-Камянецкай [27]. Выдадзена серыя кніг «Берасцейскае вогнішча». У 1998–1999 гг. выдаваўся гісторыка-краязнаўчы часопіс «Радавод» (6 нумароў). Важнай падзеяй з’явілася выданне дзвюх кніг гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць» [28], якія былі створаны на аснове новых навуковых даследаванняў, разнастайных архіўных дакументаў, друкаваных крыніц, успамінаў. Пашырэнне атрымала школьнае краязнаўства. Была распрацавана праграма «Бярэсцезнаўства» для малодшых школьнікаў [29]. У снежні 2006 г. адбыўся «круглы стол» «Краязнаўства Берасцейшчыны: стан і перспектывы развіцця» [30], дзе падводзіліся вынікі краязнаўчай працы і акрэслены задачы на бліжэйшую будучыню.

Значны ўклад у гістарычнае краязнаўства ўнеслі музеі, бібліятэкі. З першых пасляваенных гадоў пачалася праца па стварэнні Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея, які ў 1950 г. зацвердзіў штат і пачаў збіральніцкую працу. У 1957 г. была адкрыта яго першая экспазіцыя. Паступова музей ператварыўся ў цэнтр вывучэння гісторыі ўсёй Брэстчыны. Яго фонды актыўна выкарыстоўваюцца вучонымі, краязнаўцамі, студэнтамі. У музеі налічваюцца 23 каштоўныя калекцыі (археалагічная, нумізматычная, этнаграфічная, рукапісаў і старадрукаў, жывапісу, графікі, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і інш.) [31]. У 2019 г. асноўны фонд музея складаў 173,3 тыс. адзінак захавання, навукова-дапаможны – 56,3 тыс. адзінак. Музей і яго філіялы (археалагічны музей «Бярэсце», музей «Выратаваныя мастацкія каштоўнасці», мастацкі музей) праводзяць выстаўкі на аснове ўласных фондавых калекцый, ажыццяўляюць сумесныя праекты з творчымі саюзамі, грамадскімі арганізацыямі, мастакамі, разнастайныя культурна-адукацыйныя мерапрыемствы і інш.

Адкрыты ў 1998 г. Музей гісторыі горада Брэста налічвае ў асноўным фондзе 4 тыс. адзінак захавання, у навукова-дапаможным – больш за 600. Раздзелы пастаяннай экспазіцыі: «Архітэктурнае аблічча і гістарычнае жыццё горада ў XI – першай палове XIX ст.», «Будаўніцтва і развіццё горада на новым месцы ў сярэдзіне XIX – 40-х гг. XX ст.», «Сучасны горад» – дазваляюць прасачыць гісторыю Брэста са старажытнасці да сучаснасці. У музеі з’явіўся арыгінал Брэсцкай Бібліі 1563 г., падараваны жыхарам горада Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкам 6 верасня 2019 г. на ўрачыстым мерапрыемстве да 1000-годдзя Брэста. *«У Год малой радзімы гэтая вечна жывая кніга вяртаецца дахаты. Нашы продкі лічылі, што горад, у якім выдавалася Біблія, знаходзіцца пад асаблівай абаронай нябёсаў. Яго ніколі не могуць зруйнаваць ні час, ні людзі»*, – заявіў кіраўнік дзяржавы [32]. Трэба спадзявацца, што набыты пры дапамозе мясцовых прадпрымальнікаў фаліянт будзе садзейнічаць гісторыка-краязнаўчай працы ў горадзе.

Музей абароны Брэсцкай крэпасці быў адкрыты ў 1956 г. намаганнямі яго першага дырэктара А. Крупеннікава. Цяпер у яго 10 залах пастаяннай экспазіцыі адлюстравана гісторыя Брэсцкай крэпасці з моманту яе праектавання, будаўніцтва, у час Першай і Другой сусветных войнаў. Як пастаянная экспазіцыя музея, так і V форт крэпасці, экспазіцыі «Музей вайны – тэрыторыя міру», «Армейскі клуб» актыўна выкарыстоўваюцца для ваенна-патрыятычнага выхавання моладзі.

Геаічная абарона Брэсцкай крэпасці ў чэрвені–ліпені 1941 г. набыла ўсесаюзнае і міжнароднае прызнанне дзякуючы савецкаму пісьменніку С. Смірнову [33–37]. Больш за 10 гадоў жыцця ён прысвяціў вывучэнню абароны крэпасці і пошуку яе абаронцаў. Музей абароны Брэсцкай крэпасці на працягу ўсёй сваёй гісторыі нястомна праводзіць пошукавую працу абаронцаў, высвятляе іх лёс, падтрымлівае сувязі з іх сваякамі. У адкрытым у 1971 г. мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой» пастаянна ажыццяўляецца навукова-даследчыцкая дзейнасць па вывучэнні гістарычнай і духоўнай спадчыны Брэсцкай крэпасці, наладжваюцца навукова-практычныя канферэнцыі, «круглыя сталы» і іншыя мерапрыемствы.

У музеях г. Брэста ўжо шмат гадоў самаадданна працавалі ці працягваюць працоўную эстафету Т. Слесарук, Т. Ходцава, С. Тамчук, Т. Новікава, А. Міцюкоў, Н. Кірылава, І. Тарыма, В. і С. Гуляевы, С. Шчэрба, Л. Бібік, А. Харычкава, А. Каркатадзэ і іншыя музейныя супрацоўнікі.

Заснаваная яшчэ ў 1940 г. Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага была адкрыта для чытачоў у 1950 г. У 2019 г. яе ўніверсальны фонд склаў 887,7 тыс. экзэмпляраў. У 1969 г. быў створаны аддзел беларускай літаратуры і краязнаўства (з 1994 г. – аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі, загадчык Т. Кавенька, цяпер – І. Жалянгоўская), выдзелены краязнаўчы фонд, пачаў ствараццa сістэматычны краязнаўчы каталог. На сайце бібліятэкі ёсць субдамен «Краязнаўства Берасцейшчыны», што ўключае ўласныя базы даных па краязнаўстве – «Спадчына», «Памяць», «Брэсцкі мір» і інш. Бібліятэка на абласным узроўні каардынуе фарміраванне рэгіянальнага зводнага каталогу. Сярод 2,5 тыс. экземпляраў кніг сектара рэдкай кнігі захоўваюцца ўнікальныя выданні, у т. л. фрагмент арыгінала Брэсцкай Бібліі. Бібліятэка з’ўлялася ініцыятарам шэрагу міжнародных навукова-даследчыцкіх праектаў краязнаўчай тэматыкі, прысвечаных Брэсцкай Бібліі [38], кніжнай спадчыне Сапегаў, Ю. Крашэўскага і інш. З 2008 г. там праводзяцца міжнародныя навукова-практычныя канферэнцыі «Берасцейскія кнігазборы» (немалая заслуга ў гэтым А. Мяснянкінай), разнастайныя «круглыя сталы», прэзентацыі краязнаўчых выданняў і інш.

Сярод цэнтраў краязнаўчай працы ў горадзе трэба адзначыць і Брэсцкую цэнтральную гарадскую бібліятэку імя А. С. Пушкіна, адкрытую ў 1940 г. У бібліятэцы праводзяцца разнастайныя сустрэчы з мясцовымі літаратарамі, наладжваюцца прэзентацыі краязнаўчых выданняў.

Створаны ў 1940 г. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці мае больш за 1,1 млн адзінак захавання (2019 г.). Яны з’ўляюцца каштоўнымі крыніцамі па гісторыі Брэста ў складзе Польшчы ў 1919–1939 гг., у час германскай нацысцкай акупацыі 1941–1944 гг., у савецкі перыяд 1939–1941, 1944–1991 гг. і ў незалежнай Рэспубліцы Беларусь. Рэгулярна арганізуюцца выставы архіўных дакументаў, прысвечаныя памятным датам, падзеям у гісторыі горада. Сярод найбольш значных публікацый архіва апошняга дзесяцігоддзя трэба адзначыць зборнікі дакументаў і матэрыялаў (укладальнікі – Г. Карапузава і іншыя архівісты і гісторыкі) [39–41].

Багатыя традыцыі літаратурнага, геаграфічнага, гістарычнага краязнаўства мае Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна, адкрыты ў 1945 г. як настаўніцкі інстытут. Літаратурнае краязнаўства асабліва актывізавалася пад кіраўніцтвам У. Калесніка. У гонар У. Калесніка ва ўніверсітэце прысуджаецца прэмія ў галіне сацыяльных

і гуманітарных навук, праводзяцца навуковыя чытанні, выдаюцца кнігі ўспамінаў пра настаўніка [42], дзейнічае Адукацыйна-асветны цэнтр імя У. Калесніка. Пытанням літаратурнага краязнаўства ў школе надавала асаблівую ўвагу В. Я. Зарэцкая (Ляшук) [43], якая доўгі час узначальвала кафедру методыкі выкладання беларускай літаратуры і краязнаўства. В. Я. Зарэцкая (Ляшук) і яе калегі выдалі шэраг кніг пра літаратуру Берасцейшчыны [44–46]. Шматлікія гісторыка-літаратурныя працы напісалі М. Мішчанчук, А. Майсейчык, Г. Праневіч, І. Калянковіч і інш. Моваазнаўчымі даследаваннямі, дыялектамі працяглы час займаліся Г. Малажай, М. Аляхновіч і інш. На сучасным этапе традыцыі літаратурнага краязнаўства на філалагічным факультэце працягваюць З. Мельнікава, У. Сенькавец, Г. Ішчанка і інш. Дыялекталагічныя даследаванні ажыццяўляе Л. Леванцэвіч, гісторыю СМІ вывучае В. Смаль і інш. На філалагічным факультэце дзейнічае вучэбная фальклорна-краязнаўчая лабараторыя (кіраўнік – І. Швед), ладзяцца фальклорна-краязнаўчыя святы «Ад прадзедаў спакон вякоў…» і іншыя мерапрыемствы.

Сярод пачынальнікаў гістарычнага краязнаўства ва ўніверсітэце быў У. Мелішкевіч, які стаяў у вытокаў адкрыцця ў 1991 г. гістарычнага факультэта. Выкладчыкі гістарычнага факультэта прымалі ўдзел у падрыхтоўцы гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць» г. Брэста, іншых гісторыка-краязнаўчых выданняў, у т. л. прысвечаных гісторыі БрДУ імя А. С. Пушкіна [47–48]. Этнаграфічнымі даследаваннямі Заходняга Палесся займаўся С. Жлоба. Краязнаўчая тэматыка рэгулярна з'яўляецца прадметам вывучэння курсавых і дыпломных прац студэнтаў, магістарскіх дысертацый. Шматлікія публікацыі змешчаны ў зборніках навуковых прац «Берасцейскі храногpаф», «Моладзь Берасцейшчыны» і інш. Разнастайныя аспекты краязнаўства Брэста разглядаюцца на міжнародных навуковых канферэнцыях «Асоба ў гісторыі: гераічнае і трагічнае», «Праваслаўе ў духоўным жыцці Беларусі» і інш. Ажыццяўляюцца археалагічныя даследаванні на аб'ектах гісторыка-культурнай спадчыны (у т. л. на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці, на месцах новабудоўляў), этнаграфічныя і краязнаўчыя даследаванні праводзяцца ў час вучэбных практык.

Кафедры гістарычнага факультэта прымаюць удзел у распрацоўцы разнастайных пытанняў краязнаўства. На кафедры гісторыі Беларусі праводзяцца даследаванні па мемарыялізацыі падзей Вялікай Айчыннай вайны, распрацаваны спецкурс па гісторыі Брэста і інш. На кафедры гісторыі славянскіх народаў выконваўся праект «Гарады і раёны Брэстчыны: гісторыя і сучаснасць», прысвечаны Івацэвіцкаму, Маларыцкаму, Іванаўскаму раёнам, пачынальнікам якога быў А. Гарбацкі, дзейнічае музейная экспазіцыя. На кафедры ўсеагульнай гісторыі вывучаецца гісторыя Брэста міжваеннага часу, гісторыя яўрэйскай абшчыны Брэста [49], створана база па вуснай гісторыі 20–30-х гг. XX ст. і інш. Зараз гісторыка-краязнаўчай праблематыкай займаюцца А. Вабішчэвіч, У. Здановіч, А. Пашковіч, А. Башкоў, А. Свірыд, А. Савіч, Н. Самасюк, В. Піліповіч, А. Бодак, А. Бурык, Т. Мілач, Я. Разенблат, Н. Галімава, П. Гарбуль, Т. Саўчук, П. Рамановіч, Я. Занько, Р. Чуль і інш.

Геаграфічнае краязнаўства атрымала развіццё на геаграфічным факультэце. Аўтарам шэрагу вучэбна-метадычных дапаможнікаў па геаграфічным краязнаўстве з'яўляецца Я. Мяшэчка [50–52]. На факультэце праводзіліся рэспубліканскія навукова-метадычныя канферэнцыі «Краязнаўства ў вучэбна-выхаваўчым працэсе школ і ВНУ». Цяпер традыцыі геаграфічнага краязнаўства працягваюцца (на кафедры турызма і краязнаўства і інш.). На факультэце фізічнага выхавання вывучаецца гісторыя фізічнай культуры і спорту Брэстчыны (А. Зданевіч).

У Брэсцкім тэхнічным універсітэце, адкрытым у 1966 г., гісторыка-краязнаўчымі даследаваннямі займаюцца на шэрагу кафедр: гуманітарных навук (М. Стралец, Т. Лісоўская, А. Машчук, Н. Кавалёва, С. Васовіч, В. Місіюк, А. Баюра, В. Сушко і інш.), беларускай

і рускай моў (Н. Борсук, М. Жыгалава, З. Заіка, Ю. Паталкоў і інш.). Пытанні архітэктуры і горадабудаўніцтва Брэста вывучаюцца на кафедры архітэктуры (М. Уласюк (мал.), А. Андраюк, А. Дзічэнская, М. Уласюк (ст.), Г. Кароза і інш.). Штогод праводзіцца міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Праблемы, даследаванні, тэндэнцыі развіцця рэгіянальнай архітэктуры». Вельмі актыўна гісторыка-краязнаўчай тэматыкай займаюцца А. Гладышчук, А. Нікітчык, С. Басаў, гісторыю фізічнай культуры і спорту даследуе У. Кудрыцкі.

Вялікую ролю ў папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны, краязнаўчай працы іграюць СМІ. Старонкі гісторыі Брэста адлюстроўваюцца на тэлебачанні (рэгіянальны тэлеканал «Беларусь 4. Брэст», «Буг-ТВ» і інш.), радыё («Радыё Брэст»), у газетах «Брэсцкі веснік», «Заря», «Вячэрні Брэст», «Духоўны веснік», польскамоўным часопісе «Echa Polesia» і іншых друкаваных, электронных выданнях. З 1998 г. на Брэсцкай студыі тэлебачання пачала выходзіць тэлеперадача «Край» (аўтар і вядучы – М. Пракаповіч).

Літаратурнае краязнаўства пашыраецца дзякуючы пісьменніцкім арганізацыям – Брэсцкаму абласному аддзяленню Саюза пісьменнікаў Беларусі, Брэсцкаму абласному аддзяленню Саюза беларускіх пісьменнікаў і іх гарадскім аддзелам. Краязнаўчая тэматыка прысутнічае і ў творчасці мастакоў.

На сучасным этапе гісторыяй і краязнаўствам Брэста займаюцца не толькі ва ўстановах культуры, адукацыі, але і грамадскія арганізацыі, аб’яднанні, прыватныя асобы. Цяпер шмат краязнаўчага матэрыялу змяшчаецца ў сацыяльных сетках, у Інтэрнэце. З 2013 г. дзейнічае некамерцыйная арганізацыя «Фонд развіцця Брэсцкай крэпасці», якая займаецца пошукам, зборам архіўных і іншых дакументальных матэрыялаў (выдае атлас [53]), папулярызацыяй гісторыі горада.

Сучасныя гісторыка-краязнаўчыя выданні маюць відавую разнастайнасць: навуковыя, навукова-папулярныя, вучэбныя, даведачныя, літаратурна-мастацкія, духоўна-асветніцкія, рэкламна-інфармацыйныя і інш. Рэгіянальная праблематыка знайшла адлюстраванне ў энцыклапедычных выданнях [54–55]. Розныя аспекты мінулага горада выкладзены ў працах супрацоўнікаў НАН Беларусі, асабліва Інстытута гісторыі – у фундаментальных навуковых даследаваннях «Нарысы гісторыі Беларусі» (у 2 кн.), «Гісторыя Беларусі» (у 5 т.), «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» (у 5 т.), у манаграфіях – пра Брэсцкі мір 1918 г. [56] і інш. Гісторыя Брэста і Брэсцкай крэпасці, краязнаўчы рух з’яўляюцца прадметам даследаванняў А. Карлюкевіча, В. Папко, Д. Лісейчыкава, А. Сушы, В. Лабачэўскай, С. Піваварчыка, В. Швайко, І. Цітовіча і іншых беларускіх гісторыкаў, культуролагаў, краязнаўцаў.

Гісторыя, культура Берасцейшчыны ўважліва вывучаюцца і замежнымі вучонымі. Асабліва трэба адзначыць кнігазнаўчыя працы М. Нікалаева (Санкт-Пецярбург), даследаванні пра Брэсцкую царкоўную унію 1596 г. Л. Цімашэнкі (г. Драгобыч), па гісторыі Праваслаўнай Царквы А. Міроновіча, гісторыі міжваеннага часу В. Сляшынскага (г. Беласток), П. Ціхарацкага (г. Вроцлаў) і інш. Агляд усёй гісторыі Брэста, хоць і ў выглядзе кампіляцыі, зрабіў А. Чаромін [57].

У сучасных гісторыка-краязнаўчых працах прысутнічаюць як традыцыйныя, так і новыя праблемна-тэматычныя сюжэты. Гісторыя архітэктуры старажытнага Бярэсця, замка разглядаецца ў кнізе А. Вараб’я і А. Жаркова [58]. Па-ранейшаму застаецца запатрабаванай гісторыя Брэсцкай крэпасці (У. Бяшанаў, А. Сувораў і інш.) [59–62]. І. Чайчыц пастараўся зафіксаваць надпісы і малюнкі на яе сценах [63]. Антыфашысцкаму падполлю Брэста, лёсам сем’яў чырвонаармейцаў у гады Вялікай Айчыннай вайны прысвечаны кнігі Г. Грабёнкінай [64–65]. Новыя старонкі ў дзейнасці Брэсцкага ўпраўлення дзяржбяспекі БССР раскрыты ў працах І. Кеза [66–67]. У навукова-папулярных кнігах В. Мароза [68–69], А. Суворава [70], дакументальных хроніках В. Сары-

чава [71–72] даецца як агульны агляд гісторыі горада, так і яе фрагменты. Цяпер вялікае распаўсюджанне атрымоўваюць юбілейныя выданні: да юбілеяў Маскоўскага і Ленінскага раёнаў г. Брэста [73–74], асобных устаноў (напрыклад, тэхнічнага ўніверсітэта [75], арганізацый, прадпрыемстваў. Гісторыя гарадскіх вуліц выкладзена В. Купцовай, Я. Мяшэчкам і інш. [76–78]. Лёс знакамітых яўрэяў – ураджэнцаў Брэстчыны прасачыў У. Глазаў [79], яўрэйскую спадчыну вывучаюць Я. Басін, І. Ваўранюк і інш. Актыўна пытаннямі краязнаўства таксама займаюцца М. Аляксандраў, Ю. Рубашэўскі, Н. Шляжко, І. Бараноўскі, У. Губенка, А. Фяцісава, А. Пашчук і інш.

У 2019 г., калі адзначаецца 1000-годдзе Брэста, быў падрыхтаваны цэлы шэраг кніжных выданняў. Быў рэалізаваны праект Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, выдавецкага дома «Сегмент» і ЗАТ «Белнафтастрах» – зроблена факсімільнае выданне Брэсцкай Бібліі (экзэмпляры атрымалі ўстановы культуры г. Брэста). Нацыянальная бібліятэка Беларусі сумесна з Брэсцкай абласной бібліятэкай імя М. Горкага, Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі ў межах віртуальнай рэканструкцыі дакументаў і матэрыялаў па рэгіянальнай гісторыі Беларусі выпусціла асобны кампакт-дыск, прысвечаны гісторыі Брэста [80]. Было завершана выданне трылогіі А. Гладышчука «Замок Берестейский» [81]. Пад агульнай рэдакцыяй У. Шпарло надрукавана кніга «Брест. Мгновения спрессованы в столетия» [82]. Новыя архіўныя дакументы, ілюстрацыйны і графічны матэрыял утрымлівае кніга А. Суворава «Брест. 1000. Истоки. Судьба. Наследие» [83].

Энцыклапедыя «Брест. 1000» (складальнік – А. Вабішчэвіч) [84] з'яўляецца наватарскім энцыклапедычным выданнем, што ўтрымлівае 14 раздзелаў: органы кіравання; гісторыя; адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел; насельніцтва; прырода; эканоміка; ахова здароўя; СМІ; грамадскія арганізацыі; рэлігія і царква; архітэктура і горадабудаўніцтва, помнікі і памятныя мясціны; фізічная культура, спорт і турызм; адукацыя, навука; культура. 28 ілюстраваных артыкулаў-разваротаў на беларускай, рускай і англійскай мовах прадстаўляюць самыя вядомыя гістарычныя сімвалы Брэста, флагманы яго эканомікі, вядучыя ўстановы адукацыі (у т. л. БрДУ імя А. С. Пушкіна), культуры, буйнейшыя спартыўныя аб'екты і каманды, фестывалі. У кнізе змешчана каля 1 тыс. артыкулаў, з іх каля 400 біяграфічных.

Адлюстраванне Брэста на старажытных картах, планах можна пабачыць на старонках выдання «Белкартаграфіі» [85]. У. Кудрыцкі, А. Навіцкі падрыхтавалі кнігу пра дасягненні ў спорце [86], пісьменніца З. Дудзюк выдала храналогію Брэста [87].

Вельмі карыснымі для далейшых гісторыка-краязнаўчых даследаванняў з'яўляюцца віртуальныя падарункі. Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь В. Папко, Л. Брыч, А. Дашко, В. Мілашэўскі пры падтрымцы Галоўнага ўпраўлення Нацбанка па Брэсцкай вобласці рэалізавалі праект – электронную копію кнігі Брэсцкага магістрата 1623–1626 гг., якая перададзена Брэсцкай цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя А. С. Пушкіна. Віртуальную выставу да юбілею горада падрыхтаваў Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі [88].

**Заключэнне**

У гісторыка-краязнаўчым вывучэнні г. Брэста можна вылучыць найбольш значныя перыяды: *сярэдзіна XIX – пачатак XX ст.* – у складзе дарэвалюцыйнай Расійскай імперыі (пачатак вывучэння Палесся і г. Брэста; павярхоўны агляд гісторыі; слабасць крыніцазнаўчай базы;); *1921–1939 гг.* – у складзе Польшчы (у кантэксце ідэй «польскага рэгіяналізму»); *1939–1941, 1944–1991 гг.* – у складзе СССР (перавага надавалася вывучэнню гісторыі Брэста і Брэсцкай крэпасці-героя ў гады Вялікай Айчыннай вайны; станаўленне і развіццё літаратурнага, геаграфічнага, гістарычнага краязнаўства; абмежаванні ў доступе да архіўных матэрыялаў і інш.); з *1991 г.* – у межах Рэспублікі Бела-

русь (актывізацыя краязнаўчага руху; значнае пашырэнне тэматыкі даследаванняў; адкрыццё доступу да разнастайных крыніц). Гісторыка-краязнаўчымі даследаваннямі займаліся ва ўстановах адукацыі, бібліятэках, музеях і іншых установах, да іх далучыліся розныя грамадскія арганізацыі, прыватныя асобы.

Падводзячы вынікі гісторыка-краязнаўчага вывучэння г. Брэста, трэба выдзеліць найбольш актуальныя і перспектыўныя пытанні яго развіцця:

1. Далейшае сістэматычнае выяўленне, навуковая апрацоўка і ўвядзенне ў навуковы зварот дакументальных крыніц па гісторыі Брэста з фондаў архіваў, бібліятэк, музеяў Беларусі і замежных краін.

2. Падрыхтоўка фундаментальнай навуковай (абагульняючай) працы па гісторыі горада Брэста.

3. Навуковая распрацоўка асобных, слаба вывучаных тэм («белых плям»).

4. Падрыхтоўка актуальных прац па гісторыі асобных устаноў, прадпрыемстваў, арганізацый, сем'яў, біяграфій знакамітых людзей і інш.

5. Каардынацыя гісторыка-краязнаўчай працы (напрыклад, на базе гістарычнага факультэта БрДУ імя А. С. Пушкіна), стварэнне асобнага гісторыка-краязнаўчага сайта Брэсцкай вобласці (часопіса, альманаха).

6. Візуальна-знакавае пазначэнне (у т. л. віртуальнае) у гарадской прасторы «месцаў памяці», архітэктурных аб'ектаў мінулага, што не захаваліся да сучаснасці.

7. Вывучэнне гісторыі г. Брэста ў сярэдніх школах (факультатыў «Брэстазнаўства» і інш.).

8. Навучэнне і навукова-метадалагічная падрыхтоўка па краязнаўстве студэнтаў, будучых настаўнікаў.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Святы Афанасій, ігумен Брэсцкі : дыярыуш : жыццеапісанне прападобнамучаніка Афанасія, ігумена Брэсцкага : аповесць пра пакуты і смерць айца Афанасія Філіповіча. – Мінск : Прыход Свята-Петра-Паўлаўскага сабора, 2018. – 59 с.

2. Шпилевский, П. М. Путешествие по Полесью и Белорусскому краю / П. М. Шпилевский. – СПб., 1858. – 242 с.

3. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами штаба: Гродненская губерния : в 2 ч. / сост. П. О. Бобровский. – СПб. : Тип. департамента Генер. штаба, 1863. – Ч. 1. – 870 с. ; Ч. 2. – 1076 с.

4. Памятные книжки Гродненской губернии (1847–1915) [Электронный ресурс] / Нац. б-ка Беларуси ; сост. Т. В. Дробышевская ; под науч. ред. Т. В. Кузьминич. – Минск : НББ, 2013. – 1 электрон. опт. диск (DVD-ROM).

5. Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею. Т. III. Акты Брестского гродского суда XVI–XVIII вв. – Вильно : Тип. губерн. правления, 1870. – 435 с.

6. Полесье. Библиографические материалы по истории, географии, статистике, этнографии и экономическому состоянию Полесья (Северо-Западный и Юго-Западный край вообще и губернии: Минская, Гродненская, Волынская, Киевская и Могилевская в частности). – СПб. : Тип. Д. И. Шеметкина, 1883. – 275 с.

7. Паевский, Л. С. Город Брест-Литовск и его древние храмы (исторический очерк) / сост. Л. Паевский. – Гродно : Тип. губерн. правления, 1894. – 107 с.

8. Ир тегило, т. е. Славный город: история города Брест-Литовска. – Варшава : Тип. В. Тиля, 1886. – 224 с. (иврит).

9. История города Брест-Литовска. 1016–1907: по достоверным источникам и правдоподобным умозаключениям / сост. Х. Зоненберг. – Брест-Литовск : Тип. И. Кобринца, [1907]. – 104 с.

10. Календарь-справочник гор. Брест-Литовска на 1913 год / сост. Я. М. Хмелевский. – Брест-Литовск : Тип. И. Кобринца, 1912. – 136 с.

11. Полное собрание русских летописей. Т. 2. Ипатьевская летопись / под ред. А. А. Шахматова. – 2-е изд. – СПб. : Тип. М. А. Александрова, 1908.

12. Вабішчэвіч, А. М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст : Выд-ва БрДУ, 2008. – 319 с.

13. Mondalski, W. Brześć Podlaski (Brześć Litewski, Brześć nad Bugiem): zarys geograficzno-historyczny. – Turek : Wydaw. Regionalne, 1929. – 112 s.

14. Horoszkiewicz, R. Krótki zarys dziejów Brześcia n/B. / R. Horoszkiewicz. – Brześć nad Bugiem, 1926. – 16 s.

15. Тихомиров, М. Н. Древнерусские города / М. Н. Тихомиров. – 2-е изд., доп. и перераб. – М. : Госполитиздат, 1956. – 477 с.

16. История Белорусской ССР : в 2 т. – Минск : Изд-во АН БССР, 1961. – Т. 1. – 701 с.

17. Вабішчэвіч, А. М. «Вечна будзеш ты малады, Брэст наш, квітнеючы горад!»: як адзначалася 950-годдзе Брэста / А. М. Вабішчэвіч // Беларус. гіст. часоп. – 2019. – № 9. – С. 9–16.

18. Брест : ист.-экон. очерк / В. Я. Науменко. – 2-е изд., перераб. и доп. – Минск : Наука и техника, 1977. – 177 с.

19. Лысенко, П. Ф. Берестье / П. Ф. Лысенко ; АН БССР, Ин-т истории. – Минск : Наука и техника, 1985. – 395 с.

20. Лысенко, П. Ф. Открытие Берестья / П. Ф. Лысенко. – Минск : Наука и техника, 1989. – 159 с.; 2-е изд., доп. – Минск : Белорус. наука, 2007. – 181 с.

21. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Брэсцкая вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; Беларус. Савет. Энцыкл. – Мінск : Беларус. Савет. Энцыкл., 1984. – 368 с.

22. Брест : энцикл. справ. – Минск : Белорус. Совет. Энцикл., 1987. – 407 с.

23. Несцярчук, Л. М. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Асноўныя этапы фарміравання, сучасны стан і перспектывы / Л. М. Несцярчук. – Мінск : БЕЛТА, 2003. – 283 с.

24. Гістарычная і культурная спадчына Берасцейшчыны. – Брэст : Ред. Брест. обл. газ. «Заря», 2016. – 187 с.

25. Несцярчук, Л. М. Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X–XX стагоддзяў: гісторыя, стан, перспектывы / Л. М. Несцярчук. – 2-е выд., дап. – Мінск : БЕЛТА, 2005. – 334 с.

26. Монтвилов, М. В. Русская гимназия в Бресте на Буге. 1919–1939 / М. В. Монтвилов. – Ницца : Брест : Минск, 1996. – 119 с.

27. Ващукувна-Каменецка, Д. Брест – город незабываемый / Д. Ващукувна-Каменецка. – Брест : Изд-во С. Лаврова, 2000. – 283 с.

28. Памяць. Брэст : гіст.-дакум. хроніка : у 2 кн. – Мінск : БЕЛТА, 1997–2001. – Кн. 1. – 1997. – 574 с. ; Кн. 2. – 2001. – 685 с.

29. Аўтарская праграма ўрокаў «Бярэсцезнаўства» (пачатковая школа) / Брэсц. абл. ін-т павышэння кваліфікацыі і перападрыхт. кіруючых работнікаў і спец. адукацыі. – Брэст : Выд. дом С. Лаўрова, 2001. – 59 с.

30. Краязнаўства Берасцейшчыны: стан і перспектывы развіцця : матэрыялы «круглага стала», 12 снеж. 2006 г. – Брэст : БрДУ, 2007. – 56 с.

31. Брестский областной краеведческий музей / сост. Н. М. Кириллова. – Брест : Брест. тип., 2018. – 66 с.

32. Рабочая паездка ў Брэст. 6 верасня 2019 г. [Электронны рэсурс] // Афіцыйны Інтэрнэт-партал Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. – Рэжым доступу: http://www.president.gov.by/ru/news_ru/view/rabochaja-poezdka-v-brest-21949/. – Дата доступу: 10.09.2019.

33. Смирнов, С. Крепость над Бугом / С. Смирнов. – М. : Искусство, 1956. – 117 с.

34. Смирнов, С. Брестская крепость : краткий очерк героической обороны 1941 года / С. Смирнов. – М. : Воен. изд-во Мин-ва обороны СССР, 1957. – 167 с.

35. Смирнов, С. Герои Брестской крепости / С. Смирнов. – М. : Молодая гвардия, 1961. – 236 с.

36. Смирнов, С. С. Собр. соч. : в 3 т. / С. С. Смирнов. – М. : Молодая гвардия, 1973. – Т. 1 : Брестская крепость ; Крепость над Бугом. – 528 с.

37. Смирнов, С. С. Брестская крепость : к 70-летию Победы / С. С. Смирнов. – М. : Терра : Книж. клуб Книговек, 2015. – 459 с.

38. Брэсцкая Біблія – унікальны помнік культуры XVI стагоддзя: новыя даследаванні і матэрыялы = Biblia Brzeska – unikatowy zabytek kultury XVI wieku: nowe badania i materiały. – Мінск : Паліграфкамбінат імя Я. Коласа, 2015. – 272 с.

39. Брест в 1919–1939 гг.: документы и материалы / сост.: А. Г. Карапузова (отв. сост.) [и др.] ; редкол.: Е. С. Розенблат (гл. ред.) [и др.]. – Брест : Альтернатива, 2009. – 306 с.

40. Брест в 1939–1941 гг.: документы и материалы / сост.: А. Г. Карапузова [и др.]. – Брест : Альтернатива, 2012. – 245 с.

41. Брест в 1941–1944 гг. Оккупация: документы и материалы / сост.: А. Г. Карапузова [и др.]. – Брест : Альтернатива, 2016. – 313 с.

42. Пасланец Праметэя : кніга пра Уладзіміра Калесніка / уклад.: З. М. Календнік [і інш.]. ; рэдкал.: Г. М. Праневіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Брэст : БрДУ, 2007. – 387 с.

43. Ляшук, В. Я. Літаратурнае краязнаўства ў школе / В. Я. Ляшук. – Мінск : Выш. шк., 1991. – 150 с.

44. Ляшук, В. Я. Літаратура Берасцейшчыны / В. Я. Ляшук, Г. М. Снітко. – Брэст : Выд. Лаўроў, 1999. – 373 с.

45. Літаратурная Берасцейшчына : краязн. нарысы, партр., арт. / В. Я. Ляшук, Г. М. Снітко. – Мінск : Лит. и Искусство, 2008. – 319 с.

46. Літаратурная карта Берасцейшчыны. – Брэст : Брэсц. друкарня, 2008. – 567 с.

47. Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна: старонкі гісторыі / пад агул. рэд. М. Э. Часноўскага. – Брэст : БрДУ, 2005. – 251 с.

48. Ад настаўніцкага інстытута да ўніверсітэта: этапы станаўлення БрДУ імя А. С. Пушкіна / У. В. Здановіч [і інш.] ; рэдкал.: Г. М. Сендзер (гал. рэд.) [і інш.]. – Брэст : БрДУ, 2015. – 77 с.

49. Розенблат, Е. С. «Жизнь и судьба» Брестской еврейской общины XIV–XX вв. / Е. С. Розенблат. – Брест, 1993. – 84 с.

50. Мешечко, Е. Н. Географическое краеведение : учеб. пособие / Е. Н. Мешечко. – Минск : Выш. шк., 1986. – 144 с.

51. Мешечко, Е. Н. Географическое краеведение : учеб. пособие / Е. Н. Мешечко. – Минск : Экоперспектива, 2002. – 335 с.

52. Мешечко, Е. Н. Краеведение : учеб.-метод. пособие / Е. Н. Мешечко. – Брест : БрГУ, 2011. – 298 с.

53. Атлас крепости Брест-Литовск : в 3 т. – Брест : Фонд развития Брест. крепости, 2017. – Т. 3 : Фортовый период (1876–1915). – 287 с.

54. Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя : у 15 т. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : БелЭН, 2004–2019. – Т. 3, кн. 1 : Брэсцкая вобл. – 2006. – 525 с.

55. Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. – Минск : Беларус. Энцыкл., 2009–2019. – Т. 1 : Брестская область : в 2 кн. – 2009. – Кн. 1. – 518 с. ; Кн. 2. – 487 с.

56. Траццяк, С. А. Брэсцкі мір і грамадска-палітычныя працэсы ў Беларусі: лістапад 1917 – студзень 1919 г. / С. А. Траццяк. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 208 с.

57. Черемин, А. А. Брест. История приграничного города (X–XXI вв.) / А. А. Черемин. – М. : Первый том, 2017. – 383 с.

58. Город и замок Брест Литовский / А. В. Воробей, А. В. Жарков. – Брест : БрГТУ, 2018. – 163 с.

59. Бешанов, В. В. Брестская крепость / В. В. Бешанов. – 2-е изд., доп. – Минск : Беларусь, 2005. – 159 с.

60. Брестская крепость. Война и мир / авт. концепции и текста А. М. Суворов. – 4-е изд., перераб. и доп. – Брест : Полиграфика, 2015. – 255 с.

61. Брестская крепость на ветрах истории / авт. концепции и текста А. М. Суворов. – Брест : Ред. журн. СЭЗ, 2004. – 151 с.

62. Брест. Лето 1941 г.: документы, материалы, фотографии / сост.: К. Ганцер [и др.]. – 2-е изд., испр. – Смоленск : Инбелкульт, 2017. – 727 с.

63. Надписи и рисунки на стенах Брестской крепости / И. Н. Чайчиц [и др.]. – Брест : БрГТУ, 2018. – 51 с.

64. Гребенкина, А. А. Брест непокоренный: антифашистское подполье г. Бреста и Брестского района в годы Великой Отечественной войны (1941–1944) / А. А. Гребенкина. – Минск : БелЭн, 2005. – 311 с.

65. Гребенкина, А. А. Живая боль: женщины и дети Брестского гарнизона (1941–1944) / А. А. Гребенкина. – Минск : Беларусь, 2008. – 173 с.

66. Кез, И. В. Руководствуясь военным положением: спецгруппы НКГБ БССР в тылу врага. Западная Белоруссия. 1941–1944 гг. / И. В. Кез. – Брест : Альтернатива, 2017. – 206 с.

67. Кез, И. В. Противостояние: Западная Белоруссия. Управления НКВД (НКГБ) – МГБ БССР по Брестской, Пинской и Барановичской областям, 1939–1954 / И. В. Кез. – Брест : Альтернатива, 2019. – 283 с.

68. От Берестья до Бреста из века в век / В. Мороз, В. Ежелов. – Брест : Академия, 2004. – 229 с.

69. Мароз, В. Драўляныя сакральныя помнікі Берасцейшчыны : нарысы гісторыі, археалогіі і культуры / В. Мароз. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2018. – 511 с.

70. Брест. На перекрестке дорог и эпох: 1019–2009 / авт. концепции и текста А. М. Суворов. – Брест : Полиграфика, 2009. – 239 с.

71. Сарычев, В. В. В поисках утраченного времени : в 6 кн. / В. В. Сарычев. – 2-е изд., испр. – Брест, 2010–2016. – Кн. 1. – 2010. – 305 с. ; Кн. 2. – 2015. – 303 с. ; Кн. 3. – 2016. – 295 с.

72. Сарычев, В. В. В поисках утраченного времени : в 6 кн. / В. В. Сарычев. – Брест, 2010–2017. – Кн. 4. – 2011. – 297 с. ; Кн. 5. – 2013. – 297 с. ; Кн. 6. – 2017. – 293 с.

73. Брест. Московский район: портрет на фоне времени / авт. концепции и текста А. М. Суворов. – Брест : Полиграфика, 2013. – 207 с.

74. Историческое сердце Бреста. Ленинский район: 40 лет / авт. текста Н. Васюк. – Брест : Вечер. Брест, 2018. – 101 с.

75. Кудрицкий, В. Н. Наша история: 40-летию Брестского государственного технического университета посвящается (1966–2006 гг.) / В. Н. Кудрицкий. – Брест : БрГТУ, 2006. – 239 с.

76. Купцова, В. Г. Я иду по городу, по знакомой улице...: путешествия по улицам довоенного и современного Бреста / В. Г. Купцова. – Брест : Альтернатива, 2007. – 247 с.

77. Мешечко, Е. Н. Брест сегодня. Их именами названы улицы города : путеводитель / Е. Н. Мешечко. – Брест : Брест. тип., 2016. – 174 с.

78. Улицы Бреста рассказывают... / Л. Илларионова [и др.] ; под общ. ред. П. Н. Тишука. – Брест : Вечер. Брест, 2008. – 139 с.

79. Симфония еврейских судеб Брестчины: книга об именитых земляках / сост. В. Глазов. – Брест : Брест. тип., 2015. – 159 с.

80. 1000-годдзе Брэста: праз прызму старадаўніх дакументаў [Электронны рэсурс] / Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага, Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ; склад.: І. У. Градоўкіна [і інш.] ; аўт. навук. арт.: Н. Ю. Бярозкіна, А. М. Латушкін ; навук. рэд. Т. В. Кузьмініч. – Мінск : Нац. б-ка Беларусі, 2019. – 1 электрон. апт. дыск (DVD).

81. Гладыщук, А. А. Замок Берестейский : в 3 кн. / А. А. Гладыщук. – Гродно : ЮрСаПринт, 2017–2019. – Кн. 1 : Русь. – 2017. – 288 с. ; Кн. 2 : Литва. – 2018. – 312 с. ; Кн. 3 : Res Publica. – 2019. – 239 с.

82. Брест. Мгновения спрессованы в столетия / Ю. Рубашевский [и др.] ; гл. ред. В. Шпарло. – Брест : Вечер. Брест, 2019. – 144 с.

83. Брест. 1000. Истоки, судьба, наследие / авт. текста А. М. Суворов. – Брест : Полиграфика, 2019. – 320 с.

84. Брест. Брэст. Brest. 1000 / сост. А. Н. Вабищевич. – Минск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2019. – 456 с.

85. Брэст на старадаўніх картах і планах. – Мінск : Белкартаграфія, 2019. – 96 с.

86. Кудрицкий, В. Н. Город над Бугом: история, спорт, достижения / В. Н. Кудрицкий, А. А. Новицкий. – Брест : Брест. тип., 2019. – 204 с.

87. Дудзюк, З. І. Брэст : храналагічны даведнік / З. І. Дудзюк. – Брэст : Альтернатива, 2019. – 93 с.

88. Віртуальная выстава «Берестье/Bressicia/Брэст: пад стрэлкамі ратушнага гадзінніка» (да 1000-годдзя Брэста) [Электронный ресурс] // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Рэжым доступу: http://niab.by/newsite/ru/infarmacija-ab-vistave-brest-tisyachagoddze. – Дата доступу: 12.10.2019.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 31.10.2019

***Vabishchevich A. M.*** **The State and Prospects of Studying the History and Local History of Brest (on the 1000th Anniversary of the City)**

*The author analyzed the study of history and local history of the city of Brest, which celebrated its 1000th anniversary in 2019. The article considers the most significant and original publications devoted to the history of Brest. The main periods in the study of the history of the city are highlighted, the characteristic features of each of the periods are indicated. A great contribution to the study of regional studies of the city was made by various educational institutions, including Brest State University named after A. S. Pushkin, cultural institutions, government, public organizations, intelligentsia.The author identified unresolved problems in the study of the history of Brest, outlined a number of proposals for the further development of research.*